# Камуністы—арганізатары барацьбы з акупантамі

**Да 20-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**

У ГАДЫ Вялікай Айчыннай вайны беларускі народ праявіў незгінальную волю, нянавісць да ворага, храбрасць і любоў да Радзімы, яшчэ цясней згуртаваўся вакол Камуністычнай партыі.

Мне, былому партызану-разведчыку, прыпамінаюцца першыя дні, калі на акупіраванай ворагам Старобіншчыне ствараўся партызанскі атрад. Ядром гэтага атрада былі камуністы, людзі, якія па закліку партыі ўзяліся за зброю, каб помсціць ворагу, хутчэй наблізіць светлы час вызвалення. Сярод іх былі т. т. Жэўноў, Бандаравец, Меркуль, Барадзіч, Хініч, Харсееў, Міхаленя і іншыя. У вёсцы Даманавічы была створана партызанская група. Яе ўзначаліў старшыня калгаса Дзмітрый Хаміцэвіч. У вёсцы Доўгае партызанскую групу арганізавалі камуністы, удзельнікі грамадзянскай вайны, Гаўрыіл Пятровіч Сцешыц і Трафім Яфімавіч Рудзеня, а таксама былы загадчык Пpагрэская пачатковай школы, зараз старшыня калгаса імя Леніна тав. Шошын У. С.

Ужо ў ліпені месяцы партызаны пачалі наносіць першыя ўдары па ворагу. Прыпамінаю такі факт. Па дарозе на Капачы спрытна імчалася легкавая машына. За рулём сядзеў гестапавец. Дарэмна радаваўся фашыст, што едзе па заваяванай тэрыторыі. Хутка ён зваліўся ад партызанскай кулі. Захапіўшы машыну з фашысцкай свастыкай, партызаны Мікалай Шатны (былы шафёр пагранатрада) Іван Барадзіч і Аляксандр Новікаў, пераапрануліся ў вопратку нямецкіх салдат, сярод белага дня праехалі праз гарнізон ворага ў г. п. Старобін, і хутка былі ў мястэчку Пагост. Тут пастаўлены акупантамі бургамістр нехта Пратасеня, наводзіў «новы парадак», збіраў звесткі аб камуністах, каб затым выдаць іх ворагу.

Некалькі слоў праз «пераводчыка» — і ля машыны з'явіўся бургамістр. Ён нізка пакланіўся і перадаў «афіцэру» спісак камуністаў, камсамольцаў, савецкага актыву. І толькі калі здраднік сеў у машыну, ён зразумеў, што папаў у рукі да тых, каго сабіраўся прадаць акупантам. Здраднік атрымаў па заслугах, а спіскі патрыётаў — былі перададзены партызанскаму камандаванню, якое папярэдзіла іх аб небяспецы. Атрад папоўніўся баявымі сіламі.

З кожным днём баявая актыўнасць партызан расла. Былы рэдактар раённай газеты т. Жэўноў І. Е. сумесна з іншымі партызанамі перавезлі ў лес друкарню. А хутка насельніцтва магло чытаць словы звароту Цэнтральнага Камітэта партыі да народа, былі надрукаваны тысячы лістовак, адозваў і г. д.

Ужо ў ліпені вораг кінуў на партызан цэлую калону бронемашын. Ля вёскі Доўгае фашысты былі сустрэты шквальным агнём народных мсціўцаў. Кіраваў боем былы сакратар падпольнага райкома т. Меркуль. Уцякаючы, акупанты папалі на засаду ля в. Леценец. Не дапамаглі ворагу і іншыя яго крывавыя аперацыі. Партызанскі рух з кожным днём шырыўся і рос. Поўнасцю былі знішчаны масты на рэчках Случ, Марачанка, разбураліся іншыя камунікацыі ворага.

Прыпамінаю такі факт. Група партызан пад кіраўніцтвам З. Хаміцэвіча і А. Яновіча затрымалі вялікую калону гітлераўцаў, якія імкнуліся прабіцца на Палессе. Фашысцкія ваякі вымушаны былі адкрыць артылерыйскую падрыхтоўку, яны лічылі, што справу маюць не з партызанамі, а з падраздзяленнем Савецкай Арміі. На трое сутак была затрымана перасоўка фашысцкіх дывізій да фронта.

Партызаны ўжо з першых жа дзён барацьбы карысталіся падтрымкай усяго савецкага народа. Камуністы былі арганізатарамі адпору фашысцкім акупантам, іх поўнага разгрому.

**І. ЧАРНЯК,**
**былы партызан.**